# Тэхналагічная незалежнасць

**У Полацкім дзяржаўным універсітэце імя Еўфрасінні Полацкай адкрылася першая ў Беларусі адукацыйная лабараторыя лічбавых двайнікоў.**

Гаворка ідзе пра перадавы адукацыйны праект у рамках рэалізацыі плана мерапрыемстваў Міністэрства адукацыі і Міністэрства энергетыкі Беларусі. Гэта першая ў краіне вучэбная прастора, цалкам пабудаваная на айчынных лічбавых тэхналогіях, аналагічных тым, якія выкарыстоўваюцца на рэальных аб'ектах газавай галіны. Стварэнне лабараторыі стала важным крокам на шляху рэалізацыі Канцэпцыі развіцця інжынернай адукацыі да 2035 года і яркім прыкладам паспяховага ўзаемадзеяння паміж вышэйшай школай і прамысловасцю.

Ідэя праекта атрымала развіццё ў красавіку 2025 года на рабочай сустрэчы ў Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П.В.Сухога, прысвечанай падрыхтоўцы кадраў для энергетычнай галіны. У мерапрыемстве прымалі ўдзел кіраўнікі профільных міністэрстваў, рэктары вядучых універсітэтаў краіны і прадстаўнікі прамысловых прадпрыемстваў энергетычнай галіны. Па выніках сустрэчы быў падпісаны план мерапрыемстваў паміж Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам энергетыкі па інтэграцыі адукацыйных праграм з вытворчымі задачамі.

Новая лабараторыя ўяўляе сабой шматфункцыянальны лічбавы комплекс, які ўключае пяць ключавых зон:

лічбавы двайнік газаразмеркавальнай сістэмы Беларусі — дакладная віртуальная мадэль інфраструктуры, якая дазваляе мадэляваць працэсы ў рэальным часе;

мабільны лічбавы памочнік — інтэлектуальная сістэма падтрымкі вучэбнага працэсу;

інтэрактыўная зона "Прывітанне, Алёна" — платформа для дыялогу з лічбавым асістэнтам, распрацаваным на базе айчынных рашэнняў;

трэнажорна-сімуляцыйны клас — імітацыя штатных і аварыйных сітуацый для адпрацоўкі кіраўніцкіх рашэнняў;

3D-кластар — прастора для візуалізацыі і аналізу вялікіх аб'ёмаў даных.

Асаблівасць лабараторыі — выкарыстанне айчыннага праграмна-апаратнага комплексу, што забяспечвае студэнтам доступ да актуальных тэхналагічных інструментаў і рэальных прамысловых даных. Будучыя інжынеры вучацца па сцэнарыях, максімальна набліжаных да работы на дзеючым прадпрыемстве.

Лабараторыя аб'ядноўвае навуку, адукацыю і вытворчасць, фарміруючы новае пакаленне спецыялістаў, гатовых да выклікаў лічбавай эканомікі. Тут студэнты асвояць ключавыя кампетэнцыі ў галіне аўтаматызацыі, лічбавізацыі і кіравання энергасістэмамі — навыкі, неабходныя для тэхналагічнага суверэнітэту краіны.

Адкрыццё лабараторыі ў Наваполацку — чарговы крок да новага стандарту падрыхтоўкі інжынерных кадраў у Беларусі, які дэманструе, як універсітэты і прамысловасць могуць разам будаваць устойлівую і тэхналагічна незалежную будучыню.